# ДАВЕДКА

**аб праверцы статутнай дзейнасці Грамадскага аб'яднання "Праваабарончы цэнтр "Вясна" за перыяд з 01.08.2001 па 01.08.2002г.**

Мною, намеснікам начальніка Ўпраўлення грамадскіх аб'яднанняў Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь Каратковай А.В., у адпаведнасці з планам работы Ўпраўлення грамадскіх аб'яднанняў Мінюста на II паўгоддзе 2002г. праведзена праверка статутнай дзейнасці Грамадскага аб'яднання "Праваабарончы цэнтр "Вясна" (далей па тэксту - арганізацыя) за перыяд з 01.08.2001 па 01.08.2002.

Мэтамі і задачамі кантролю за дзейнасцю названага грамадскага аб'яднання з'яўляліся забеспячэнне выканання палажэнняў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, Закона Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях", іншых нарматыўных прававых актаў і свайго статута, перашкоджванне дзейнасці, якая выходзіць за межы статутных мэтаў дадзенай арганізацыі.

Крыніцамі атрымання неабходнай інфармацыі аб дзейнасці дадзенай арганізацыі з'яўляліся рашэнні і пратаколы пасяджэнняў кіруючых органаў і распарадчыя дакументы службовых асобаў, гадавая справаздача аб дзейнасці грамадскага аб'яднання, справаздача аб выкарыстанні маемасці, публікацыі і паведамленні ў друку і іншых сродках масавай інфармацыі, якія тычацца дзейнасці арганізацыі.

Дадзеная арганізацыя зарэгістравана Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь 15 чэрвеня 1999г., пасведчанне № 00111.

У ходзе праверкі ўстаноўлена, што ў арганізацыі маецца толькі арыгінал пасведчання аб рэгістрацыі.

Пячатка арганізацыі адпавядае патрабаванням, якія да яе прад'яўляюцца.

Належным чынам вядзецца Кніга уліку праверак (рэвізій) у адпаведнасці з патрабаваннямі пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 22.02.2001 № 248 "Аб вядзенні юрыдычнымі асобамі, індывідуальнымі прадпрымальнікамі кнігі ўліку праверак (рэвізій)".

Усяго праведзена чатыры пасяджэнні Агульнага сходу (апошняе пасяджэнне адбылося 20 снежня 2001 года). За правяраемы перыяд праведзена 34 пасяджэнні Рады арганізацыі. Маецца акт Рэвізійнай камісіі ад 17.12.2001г.

У ходзе праверкі ўстаноўлена, што членамі Грамадскага аб'яднання "Праваабарончы цэнтр "Вясна" ажыццяўляюцца збор інфармацыі (прававы маніторынг) аб выкананні ратыфікаваных Рэспублікай Беларусь палажэнняў Міжнародных дэкларацыяў, канвенцыяў і пактаў, маніторынг адпаведнасці міжнародным нормам у галіне абароны правоў чалавека дзеючага беларускага заканадаўства, назіранне за мясцовымі,

парламенцкімі і прэзідэнцкімі выбарамі ў Рэспубліцы Беларусь, арганізацыя і ўдзельнічанне ў міжнародных і нацыянальных канферэнцыях, круглых сталах, датычных пытанняў абароны правоў чалавека, рэгулярна дасылаюцца інфармацыйныя даклады ў Камітэты ААН, Міжнародную Федэрацыю правоў чалавека, Міжнародную лігу правоў чалавека і іншыя міжнародныя праваабарончыя арганізацыі інфрамацыю аб выкананні Рэспублікай Беларусь ратыфікаваных міжнародных дэкларацыяў, пактаў і канвенцыяў, падтрымліваюцца кантакты з міжнароднымі і замежнымі праваабарончымі арганізацыямі.

Дадзеная арганізацыя з'яўляецца адным з заснавальнікаў Асацыяцыі грамадскіх аб'яднанняў "Асамблея" (якая знаходзіцца ў працэсе рэгістрацыі).

Дзейнасць, якая падлягае ліцэнзаванню, арганізацыяй не ажыццяўляецца, прадпрымальніцкай дзейнасцю яна не займаецца, камерцыйных структур не стварае.

Асноўнымі крыніцамі фармавання грашовых сродкаў і іншай маёмасці з'яўляецца мэтавае фінансаванне праграм аб'яднання ў адпаведнасці з заключанымі дамовамі і дзеючым заканадаўствам.

Уся фінансавая справаздачнасць, у тым ліку ўплата падаткаў і іншых абавязковых плацяжоў, ажыцяўялецца ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Грамадскае аб'яднанне "Праваабарончы цэнтр "Вясна" складаецца з рэгіянальных арганізацый (аддзяленняў), якія ствараюцца па тэрытарыяльнай прыкмеце ў Рэспубліцы Беларусь пры наяўнасці 10 (3) сябраў Грамадскага аб'яднання "Праваабарончы цэнтр "Вясна".

Па рашэнню Рады створаным аддзяленням могуць быць нададзены правы юрыдычнай асобы. Структура выбарных органаў, формы і ўмовы дзейнасці рэгіянальных аддзяленняў вызначаюцца іх вышэйшым органам – Сходам.

Радай Грамадскага аб'яднання "Праваабарончы цэнтр "Вясна" створаны з наданнем правоў юрыдычнай асобы наступныя арганізацыйныя структуры:

Брэсцкае абласное аддзяленне Грамадскага аб'яднання "Праваабарончы цэнтр "Вясна (пасведчанне № 01-041 ад 25.11.1999г.);

Мінскае абласное аддзяленне Грамадскага аб'яднання "Праваабарончы цэнтр "Вясна" (пасведчанне № -06-023-СП ад 25.01.2000г.);

Гомельскае абласное аддзяленне Грамадскага аб'яднання "Праваабарончы цэнтр "Вясна" (пасведчанне № 03-00111/072 ад 17.04.2002г.);

Віцебскае абласное аддзяленне Грамадскага аб'яднання"Праваабарончы цэнтр "Вясна" (пасведчанне № 02-0072р ад 16.08.2002г.);

Баранавіцкае гарадское аддзяленне Грамадскага аб'яднання "Праваабарончы цэнтр "Вясна" (пасведчанне № 01-264 ад 28.05.2002г.);

Пінскае рэгіянальнае аддзяленне Грамадскага аб'яднання "Праваабарончы цэнтр "Вясна" (пасведчанне № 01-29).

Таксама створана Лідскае гарадское аддзяленне Грамадскага аб'яднання "Праваабарончы цэнтр "Вясна", але на ўлік не пастаўлена. У цяперашні час ў арганізацыі 75 членаў.

Між тым, маюцца парушэнні. Так, справаводства ў арганізацыі не вядзецца належным чынам, не прадстаўлены арыгінал статута. У арганізацыі маецца толькі папка пратаколаў пасяджэнняў Рады. Арганізацыя не знаходзіцца па юрыдычнаму адрасу, які ўказаны ў праваўстаноўчых дакументах.

У сувязі з чым, лічу неабходным вынесці ў адрас кіруючага органа Грамадскага аб'яднання "Праваабарончы цэнтр "Вясна" пісьмовае папярэджанне з прадстаўленнем месячнага срока выпраўлення выяўленых парушэнняў заканадаўства і паўторна праз тры месяцы праверыць статутную дзейнасць арганізацыі.

Намеснік начальніка Ўпраўлення
грамадскіх аб'яднанняў А.В.Караткова

03.08.2002

Довідку
отримала